З каталіцкіх СМІ (196)

Аўтар: Рэдакцыя
13.10.2019 00:00

У абарону традыцыйнай сям'і ***У сувязі з небяспекай прапаганды аднаполых зносін сярод непаўналетніх Касцёл у Беларусі заклікае грамадства да захавання Божага права і натуральнага закону.*** Экспертная рада па пытаннях жыцця і сям'і пры Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі выказваецца ў падтрымку агульнанацыянальнага збору подпісаў пад зваротам да прэзідэнта аб прыняцці адмысловай праграмы ў абарону традыцыйнай сям'і. У падрыхтаваным звароце заканадаўцы заахвочваюцца да прыняцця законаў у адпаведнасці з вечна актуальнымі этычнымі нормамі.

Першая падобная акцыя прайшла ў мінулым годзе.

За 2 тыдні было сабрана больш за 7 тысяч подпісаў.

†

Абраз з кухні ***Калі жанчына з мясцовасці Камп'ень (Францыя) вырашыла прадаць абраз, які шмат гадоў вісеў у яе на кухні, высветлілася, што гэта мастацкі шэдэўр.*** Эксперты не сумняваюцца, што абраз выйшаў з-пад рукі творцы перыяду Протарэнесансу Чымабуэ. Датуемы 1280 годам, ён даўно лічыўся згубленым. Сёння абраз ацэнены ў 6 мільёнаў еўра і трапіць на аўкцыён.

Твор пад назвай "Высмеяны Хрыстос" з'яўляецца часткай вялікага дыптыха, які адлюстроўвае 8 сцэн з мукі і ўкрыжавання Пана Езуса. 2 іншыя абразы знаходзяцца "пад апекай" музеяў: "Беззаганную з Дзіцём і двума анёламі" можна ўбачыць у Лонданскай Нацыянальнай галерэі (Вялікабрытанія), а "Бічаванне Хрыста" – у калекцыі Фрыка ў Нью-Ёрку (ЗША).

Польшча для Афрыкі ***Больш за 10 тысяч шчотак і амаль 8 тысяч зубных паст атрымалася сабраць у межах акцыі "для дзяцей з Чада".***

Акцыю зладзіў душпастырскі аддзел Плоцкай дыяцэзіяльнай курыі разам з Місійнай дыяконіяй руху "Святло-Жыццё" Плоцкай дыяцэзіі. Да яе далучыліся школы, парафіі і рэлігійныя таварыствы.

Ідэя мерапрыемства ўзнікла ў сувязі з трываючым у Паўсюдным Касцёле

Аўтар: Рэдакцыя
13.10.2019 00:00

Надзвычайным місійным месяцам. Сабраныя падчас акцыі рэчы будуць адпраўлены ў місію Байкара ў Чадзе.